# САЦЫЯЛЬНЫ ФЕНОМЕН СВАБОДЫ СЛОВА

***А. Г. Слука***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*olegslucka@yandex.ru*

Свабода слова – гэта вышэйшая інтэлектуальная каштоўнасць праяўлення існасці асобы, аснова існавання грамадства і функцыянавання дзяржавы. У артыкуле прадстаўлены меркаванні аўтара аб значнасці феномену свабоды слова як для прафесійнага журналіста і публіцыста, так і для соцыума ў цэлым.

***Ключавыя словы:*** грамадства; чалавек; ісціна; свабода слова; публіцыст; грамадская думка; інфармацыйная прастора; грамадзянская супольнасць.

# СОЦИАЛЬНЫЙ ФЕНОМЕН СВОБОДЫ СЛОВА

***О. Г. Слука***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*olegslucka@yandex.ru*

Свобода слова – это высшая интеллектуальная ценность проявления сущности личности, основа существования общества и функционирования государства. В статье представлены мнения автора о значимости феномена свободы слова как для профессионального журналиста и публициста, так и для социума в целом.

***Ключевые слова:*** общество; человек; истина; свобода слова; публицист; общественное мнение; информационное пространство; гражданское общество.

Свабода слова існуе як вяршыня ісціны, як ідэал арганізацыі грамадства і жыцця чалавека. Яе нельга прыручыць, уціснуць у нейкую формулу, заключыць у азначэнне: праўду не зловіш, як сініцу.

Свабоднае слова – гэта аснова канфлікту; вырашэнне яго – дыялектыка жыцця. Аснова канфлікту ў тым сэнсе, што публіцыст у сваім аналізе рэчаіснасці адкрывае новыя ідэі, што дазваляе грамадству зрабіць важны крок наперад у культурным развіцці.

Свабода слова як імкненне да ісціны – адзін з дзейсных рухавікоў прагрэсу. Яна не бывае ўсеагульнай. Агульным бывае толькі пажаданне, каб яна збывалася ў рэчаіснасці, каб можна было праўдзівае слова прамовіць, прачытаць і пачуць. Свабода слова як вышэйшая грамадская каштоўнасць ахоўваецца мудрымі і таленавітымі журналістамі. Мудрыя шукаюць і знаходзяць, куды ісці чалавеку, бачаць, дзе яму будзе ўтульна, што патрэбна рабіць, каб квітнела краіна і яе грамадзяне былі заможнымі і свабоднымі. Толькі ў свабодным слове можа засвяціцца заўтрашні шчаслівы дзень. Творчы талент можна атаясамліваць са словам свабоды не толькі па праве валодання сакрэтам публіцыстычнага вобразу і наяўнасці дару звярнуцца да людзей з трыбуны СМІ. Ён сам творца свабоднага слова. Без выражэння, здзяйснення свабода слова толькі паняцце. У таленавітых журналістаў думка, пачуцці і жыццёвыя паводзіны знаходзяцца ў адмысловай гармоніі. У іх няма раздваення паміж рэчаіснасцю, людзьмі, для якіх твор вызначаны, і асабістай свядомасцю.

Свабода слова для чалавека – субстанцыя пастаянная, вечная. Часта бывае, што журналісты атаясамліваюць свабоду творцы са свабодай слова. Гэтыя паняцці супадаюць толькі ў арганічным адзінстве. Журналіст і яго слова свабодныя, калі яны злучаюцца ў творчым працэсе. Журналіст, які знайшоў адказы на пытанні жыцця, адкрыў новыя законы адносін паміж людзьмі, раскрыў тэму ў прыгожых вобразах і лагічных доказах, імкнецца да ісціны. У такога публіцыста адчуванне праўды з’яўляецца жыццёвым наканаваннем. Здараецца, што свабода слова ў СМІ прыносіць несвабоду суб’екту даследавання. Аднак і ў дадзеным выпадку свабоднае слова выступае за чыннасць справядлівасці. Бываюць і журналісцкія памылкі, якія балюча «сыплюць соль на раны» грамадства і чалавека. Гэта «крызіс жанру». Калі журналіст свядома траўміруе грамадскую думку, то ён парушае асноўны закон свабоды слова. Богам яму не дадзена адчуваць дабро. А пра дабро нельга забываць нават тады, калі прыходзіцца ліквідаваць зло. У дадзеным выпадку свабода слова выступае як аздараўляючы фактар сацыяльнага жыцця.

У беларускай інфапрасторы свабода слова як сацыяльны феномен знаходзіцца ў працэсе набліжэння да дэмакратычнага ідэалу. На разгляд аўдыторыі прадстаўляецца спектр праблем палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця. У аналітычных матэрыялах фарміруецца аб'ектыўная грамадская думка па вырашэнні важнейшых праблем соцыуму. За час існавання суверэннай Беларусі сфарміравана грамадзянская супольнасць, якая з'яўляецца паўнавартнасным партнёрам дзяржавы ў эфектыўным і справядлівым вырашэнні агульнанародных праблем.

Актуальная інфармацыя ўключае грамадскую супольнасць у актыўны працэс вырашэння палітычных і эканамічных задач дзяржавы. Масавая інфармацыя ўсебакова аналізуе складаную ўнутраную і міжнародную абстаноўку. Гэта сучасны змест дэмакратычнай медыясістэмы, якая адлюстроўвае жыццё беларускага грамадства, аб'ектыўна аналізуе палітычны працэс і дзейнасць улады. Змест беларускіх СМІ адпавядае асноўным законам ідэлогіі дэмакратычнага жыцця. Беларуская прэса своечасова пазбавілася вульгарнасці, ілжывых меркаванняў і недарэчных выказванняў, якія надараліся ў час асваення законаў дэмакратыі. Журналісцкім калегіумам кіруе цвёрдае ўсведамленне, што свабода слова – гэта прастора для тварэння шчасця, заможнасці і духоўнасці.

Богаяўная мудрасць сцвярджае: усё пачынаецца са слова, свабоднага слова. Праз свабоду слова чалавек, група людзей, народ ажыццяўляюць сваё права свабоднага жыцця, цывілізаванага развіцця, раўнапраўнага існавання ў міжнароднай супольнасці. Свабода слова – гэта заваёва народа разам са свабодай і незалежнасцю дзяржавы і імкненнем да справяллівасці грамадства і чалавека. Гэтага можна дасягнуць стваральнай працай, якая азараецца жыватворнай ідэяй незалежнага «беларускага шляху». Высакароднасць гэтай свабоднай ідэі на ўзбраенні беларускіх СМІ. Свабоднае слова для палёту, падзеі, прыгажосці нацыі, для гонару заможным жыццём. Свет свабоды не гасне нават цёмнай ноччу. Свабода слова вітае над намі пуцяводнай зоркай і журналісты яе адвечныя спадарожнікі. Яны нясуць яе людзям як ідэал свабоднага жыцця кожнага чалавека і адначасова выступаюць як яе верныя ахоўнікі.

Свабода слова – гэта складаны, але пачэсны гонар лёсу журналістаў. Публіцысты могуць і ствараюць ідэалогію свабоднага грамадства: свабоды стваральнай працы кожнага чалавека, свабоды быць заможным і духоўна багатым у свабоднай Беларусі.